

ФОКУСЫ — ГЭТА МАСТАЦТВА

ЧЫРВОНКА

БУДЗЕ НОВАЯ ВАКЦЫНА СУПРАЦЬ РАКУ 13



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 МАЯ 2021 г. ЧАЦВЕР № 88 (29457)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вячаслаў ДУРНОЎ, першы намеснік міністра спорту і турызму:**

*«У нашай краіне актыўна займаюцца фізкультурай і спортам 25,3 % жыхароў. Можа, многіх бянтэжыць гэтая лічба, але відавочна, што яна прыблізна адпавядае стану фізкультурна-спартыўнай работы ў нашай краіне. Здаровы лад жыцця становіцца модным у Беларусі, і гэта нас радуе. Гаворачы аб колькасці праведзеных у краіне спартыўна-масавых мерапрыемстваў у 2020 годзе, трэба адзначыць, што пандэмія ўнесла свае карэктывы, і было праведзена ў тры разы менш такіх стартаў, чым годам раней. Так што вучымся жыць у новых умовах. Стараемся праводзіць больш мерапрыемстваў на свежым паветры з прыцягненнем насельніцтва. Людзі спачатку з асцярогай ставіліся да нашых мерапрыемстваў, але цяпер гэтая сітуацыя выраўнялася».*

# Вясновы шопінг



Фота БелТА

**Традыцыйная выстаўка-продаж «Вясновы карагод», што праходзіць у Віцебску каля Палаца спорту, штогод прыцягвае да сябе ўвагу шматлікіх наведвальнікаў. Не стала выключэннем і чарговая — сваю прадукцыю тут прадставілі 28 устаноў прафесійнай адукацыі і 10 аддзелаў адукацыі вобласці. Жыхары і госці горада з задавальненнем набывалі швейныя тавары, абутак, сувеніры, саджанцы, вырабы з дрэва і многае іншае.**

## КОРАТКА

• Інфляцыя ў Беларусі ў красавіку склала 0,7 %.

• **Арганізатары чэмпіянату свету па хакеі прадставілі дызайн медалёў турніру.**



• Дзве медсястры Беларускага Чырвонага Крыжа ўзнагароджаны медалём Найтынгейл. Ім узнагароджаны 25 медыцынскіх сясцёр з усяго свету.

• **Генеральным дырэктарам Вялікага тэатра Беларусі прызначаны Вячаслаў Гарбузаў.**

ISSN 1990 — 763X

21088

9 771990 763008

Актуальнае інтэрв'ю

**Юрый ШУЛЕЙКА:**

## «АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА — ПАВЫСІЦЬ ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ВЫТВОРЧАСЦІ. ДЛЯ ГЭТАГА ПАТРЭБНА ПАДНЯЦЬ АГРАРНУЮ ГАЛІНУ НА БОЛЬШ ВЫСОКІ ТЭХНАЛАГІЧНЫ ЎЗРОВЕНЬ»



**Так сталася, што сваё першае інтэрв'ю на пасадзе старшыні Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта Юрый Шулейка даў «Звяздзе», і гэта невыпадкова: найстарэйшаму ў краіне выданню чытачы заўсёды давяраюць, а аўтарытэтныя суразмоўнікі з задавальненнем абіраюць «Звязду» ў якасці надзейнай пляцоўкі для таго, каб падзяліцца думкамі, меркаваннямі і планамі. І нагода для нашай сённяшняй грунтоўнай размовы на паверхні: на 11 мая прыпадае сто дзён з таго часу, як Юрый Вітольдавіч узначаліў Брэсцкі рэгіён.**

**Нагадаем, да гэтага прызначэння ён працаваў памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Гомельскай вобласці, а яшчэ крыху раней — намеснікам старшыні Гродзенскага аблвыканкама. Таму вопыт і прафесійны, і кіраўнічы, і жыццёвы ў суразмоўніка «Звязды» багаты — з гэтага і распачалі нашу размову.**

СТАР. 4-5

Транспарт

## «ЗЯЛЁНЫ» ПАРК ГАРАДСКІХ АЎТОБУСАЎ

Мінскі аўтазавод выпусціў буйную партыю найноўшых электробусаў для сталіцы нашай краіны

**Такім чынам, будучыня наступіла. Яшчэ год таму беларускі лідар нашай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка даў транспартнаму ведамству заданне па стварэнні стартавай партыі аўтобусаў на электрычнай цязе. А сёння ў гарады Беларусі пастаўлены першыя электробусы МАЗ. Хутка яны выйдуць на лініі спачатку ў абласных цэнтрах, а потым і ў самых аддаленых рэгіёнах нашай краіны.**





СТАР. 12